© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

БАЦЬКАЎШЧЫНА

ГАЗЭТА ВЫХОДЗІЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ — ЦАНА 30 Н. ФЭН.

ВОРГАН БЕЛАРУСКАЙ НАЦЫЯНАЛЬНА-ВЫЗВОЛЬНАЙ ДУМКІ

DIE WEISSRUTHENISCHE ZEITUNG „BAĆKAUŠČYNA“ („VATERLAND“)
Herausgeber: Wladimir BORTNIK
Postadresse: Die Weissruthenische Zeitung „Baćkauščyna“ („Das Vaterland“), (13 b) München 19, Schliessfach 69.

Druck: „LOGOS“, Buchdruckerei u. Verl., G.m.b.H., München 19, Bothmerstr. 14

Цана: Нямеччына: на год — 14,— м.; 6 м-цаў — 7,50 м.; 3 м-цы — 4,25 м.; ЗША і Канада: на год — 8,— д.; 6 м-цаў — 4,50 д.; 3 м-цы — 2,50 д.; 1 нумар — 0,20 д. Ангельшчына й Аўстралія: 39 шыл.; 21 шыл.; 12 шыл.; 1 шыл. Бэльгія: 210 фр.; 120 фр.; 75 фр.; 5 фр. Францыя: 800 фр.; 450 фр.; 250 фр.; 20 фр. Аргентына: 80 пэз.; 45 пэз.; 25 пэз.; 2 пэз. Перасылка лётніцкай поштай каштуе падвойна. Падвойныя нумары каштуюць падвойна. Паадзіночныя нумары газэты разам з «Каласкамі» ўважаюцца за падвойныя.

Банковае конто: Zeitung „Baćkauščyna“, Konto Nr. 357-125, Bay. Hypotheken- u. Wechselbank, München.

LE JOURNAL BIELORUSSIEN „LA PATRIE“ | DIE WEISSRUTHENISCHE ZEITUNG „DAS VATERLAND“ | THE WHITERUTHENIAN NEWSPAPER “THE FATHERLAND„

№ 44 (430) Нядзеля, 16 лістапада 1958 ГОД ВЫДАНЬНЯ 12

ЗНОЎ БЭРЛІН

Мікіта Хрушчоў выцягнуў з запазухі яшчэ адзін козыр — справу Бэрліну. Ён дамагаецца зьліквідаваньня дасюлешняга акупацыйнага статусу Бэрліну й пераданьня гораду нямецкім уладам. На першы пагляд Хрушчоў быццам-бы мае слушнасьць: акупацыя Нямеччыны ўжо даўно скончылася, стварыліся «сувэрэнныя» нямецкія дзяржавы, дык чаму Бэрлін да бясконца мае падлягаць акупацыйнаму статусу? Іншая справа, што ёсьць толькі адна сувэрэнная й свабодная Нямеччына — Нямецкая Фэдэратыўная Рэспубліка, у якой, хаця, згодна з умовай краінаў Атлянтычнага Пакту і з згодай нямецкага ўраду, знаходзіцца замежнае войска, яно ніякім чынам ня ўплывае на палажэньне ў краіне, і вывад гэтага войска абсолютна ня зьменіць гэтага палажэньня. Ува Ўсходняй-жа Нямеччыне маскоўскія марыянэткі Ульбрыхт-Гротеволь і супалка трымаюцца на штыках савецкай арміі; калі-б гэтая армія выступіла зь Нямеччыны, праўдападобна мусіла-б забраць з сабой і адміністрацыю сваіх марыянэтак, бо без савецкіх танкаў ім-бы магло быць вельмі моташна. Але гэтыя праўды й факты ня турбуюць Хрушчова і ён не заікаючыся цьвердзіць, што цяперашняе палажэньне далёка не нармальнае і яго трэба зьмяніць. А зьмяніць вельмі проста: перадаць сталіцу Нямеччыны Немцам. Усё гэта магло-б пераконваць, каб не адна драбніца, а менавіта, што цяперашні падзел Нямеччыны — палажэньне таксама не нармальнае й яго таксама трэба было-б зьмяніць. Зрабіць гэта можна шляхам правядзеньня ўсенароднага, свабоднага плебісцыту. Але на гэткі плебісцыт ува ўсходняй Нямеччыне не згаджаюцца і, праўдападобна, яшчэ доўга ня згодзяцца Хрушчоў ды ягоныя марыянэткі ў Панкоў. І яны ведаюць чаму. Як ведаем, за апошнія гады гэткіх не нармальных зьявішчаў натварылася больш: ёсьць два Кітаі, дзьве Карэі, два Ветнамы, ну й дзьве Нямеччыны. Маскоўская прапаганда быццам-бы вельмі-ж турбуецца гэтымі падзеламі й дамагаецца задзіночаньня гэтых краінаў. У запраўднасьці-ж — гэта вада на млын маскоўскіх дыктатараў і яны мараць, каб гэтыя ненармальнасьці заставаліся як найдаўжэй. Толькі ў вадным выпадку яны-б віталі задзіночаньне — калі-б гэтыя краіны задзіночыліся пад уладай камуністых.

Сяньня Хрушчоў можа быць шчодры й вялікадушны, «перадаючы» Бэрлін Немцам, бо ён нічога ня траціць. Затое заходнія дзяржавы апынуліся перад цяжкай праблемай, а сьвет — перад новай пагрозай канфлікту.

Дарэчы будзе прыгадаць генэзу й гісторыю гэтага бэрлінскага статусу. Першы тэкст адносна юрыдычнага статусу Бэрліну быў прыняты гэтак званай Эўрапэйскай кансультатыўнай камісіяй згодна з прапановамі Маскоўскай нарады міністраў замежных справаў у 1943 годзе. Паводле гэтае пастановы, Нямеччына мела быць падзеленая на тры акупацыйныя зоны, а ў раёне Бэрліну мела быць створаная зона сумеснай акупацыі. У лютым 1945 году, на канфэрэнцыі ў Ялце, было ўзгоднена прыняць ў лік акупацыйных дзяржаваў і Францыю. Пятага чэрвеня 1945 году галоўнакамандуючыя чатырох саюзных дзяржаваў ген. Айзэнгаўэр, маршал Монтгомэры, маршал Жукаў і ген. дэ Тасіньі падпісалі пагадненьне аб пераданьні савецкай арміі Турынгіі і Саксоніі, якія заняло ў той час амэрыканскае войска. З свайго боку, савецкае камандаваньне адступіла заходнім саюзьнікам частку савецкай зоны. Пратакол Патсдамскай нарады, якая адбывалася ад 17 ліпеня да 2 жнівеня 1945 году ня мае ніякіх адмысловых пунктаў адносна Бэрліну. Ён толькі пацьвярджае раней прынятыя пастановы аб акупацыі. Адносна згоднае сужыцьцё трывала тры гады. 14 ліпеня 1948 году савецкі ўрад заявіў, што заходнія дзяржавы ня маюць ніякіх правоў у Бэрліне, і пачалася адзінаццаціместячная блякада. Наважанае становішча заходніх дзяржаваў пераламала гэтую блякаду і ў травені 1949 году савецкі ўрад прызнаў «дэ факто» прысутнасьць вайсковых аддзелаў заходніх краінаў у Бэрліне і спыніў блякаду.

Сяньня Хрушчоў — праўда ў форме намёкаў — прыгадвае заходнім дзяржавам, што блякада можа паўтарыцца, таму было-б лепш, каб яны спакойна спакаваліся ды выехалі з Бэрліну. Як звычайна, Хрушчоў, быццам-бы раіцца з народам, таму ён 10 кастрычніка гаварыў: «Ці не пара было-б зрабіць адпаведныя высновы й перагледзець статус Бэрліну... бо ён зьяўляецца ненармальным, несправядлівым і шкодным...»

Хрушчоў быццам-бы раіцца, але няма ніякага сумлеву, што ўжо нешта пастанавіў; мае гатовы плян. А таму, што ён ня мае ні намеру, ні патрэбы рабіць прыемнасьці заходнім дзяржавам, дых трэба спадзявацца чарговае авантуры. Прыкрасьць будзе тым большая, што цяпер Масква будзе рабіць міны, што яна ў гэтым нічога ніякага, бо акцыю будзе весьці гэтак званы «сувэрэнны нямецкі ўрад» у Панкоў, якога да гэтага часу заходнія дзяржавы не прызнавалі і зь ім не гаварылі. А гаварыць з марыянэткамі Гротэволям-Ульбрыхтам — гэта значыць іх прызнаваць, а прызнаваць — гэта значыць скамплікаваць дачыненьні зь Нямецкай Фэдэратыўнай Рэспублікай. Вось дзе адзін з «падвохаў» хітрага Мікіты...

Рэч зразумелая, Заходні Бэрлін — аазa свабоды ў таталітарнай пустыні й у горле камунізму. Таму яны могуць пайсьці навет на цяжкую апэрацыю, каб гэтай косткі пазбавіцца. Сотні людзей з усходняй зоны штодзень уцякаюць у Заходні Бэрлін, а гэта ня прыносіць камуністым ні прыемнасьці, ні гонару.

Вельмі праўдападобна, што Хрушчоў цаляе адразу ў некалькіх зайцаў, каб забіць хоць аднаго. Пэўна-ж найбольшым дасягненьнем было-б пазбыцца косткі ў горле, але вымусіць прызнаньне «ураду» Гротэволя — таксама варта стрэлу. Далей Хрушчоў можа разьлічваць, што бэрлінскім шантажом перашкодзіць узбраеньню Нямецкай Фэдэратыўнай Рэспублікі атамнай зброяй. І пры гэтым усім ён замуціць ваду у Атлянтычным акіяне, што Хрушчоў вельмі любіць.

Ня думаем, што Хрушчоў адважыцца на вайну, якая цяпер яму і некарысная й непатрэбная. Таму можна спадзявацца, што калі Захад адважна, наважана — пасьлядоўна супрацівіцца маскоўскім шантажом — Хрушчоў у пару адступіць.

Капітулянцкія настроі, якія назіраліся па абодвух бакох Атлянтычнага акіяну ў сувязі з крызісам у Тайваньскай пратоцы, маглі заахвоціць Хрушчова да далейшых авантураў. «Ня хочам умірацъ за Квэмой!» — крычалі апартуністыя ў Амэрыцы, а тымбольш у Англіі. Можа яны таксама будуць крычэць «ня хочам умірацъ за Бэрлін». Аднак грамадзкая думка й кіраўнічыя колы Захаду хіба-ж сьведамыя, што тут ня толькі Квэмой і Бэрлін, але гэта — Лёндан, Парыж, Нью Ёрк, Манчэстэр і Чыкаго, што кажнае ўступства Маскве — гэта цьвік у сваю собскую дамавіну.

пс

Аб „тэзісах да 40-годзьдзя ўтварэньня КПБ“

Падрыхтоўка да сьвяткаваньня саракагодзьдзя БССР дасягае свайго зэніту. Побач з надыходзячым пазачарговым XX зьездам КПСС, саракагодзьдзе БССР на працягу апошніх месяцаў зьяўляецца галоўнай або ўскоснай тэмай бальшыні артыкулаў у савецкай беларускай прэсе. У гонар гэтага «юбілею» цяпер у БССР павінны працаваць і калгасьнікі, і работнікі, і інтэлігенцыя. «Увесь беларускі народ павінен годна сустрэць сваё вялікае нацыянальнае сьвята..» — заклікае партыйная прапаганда. У гонар «беларускага нацыянальнага сьвята» кампартыя Беларусі зрабіла таксама «высілак» і 31-га кастрычніка ўва ўсёй рэспубліканскай прэсе апублікавала даўжэзныя тэзісы да «саракагодзьдзя ўтварэньня камуністычнае партыі Беларусі», апрацаваныя Аддзелам прапаганды й агітацыі ЦК КП Беларусі й Інстытутам гісторыі партыі пры ЦК КП Беларусі — філіяй Інстытуту марксызму-ленінізму пры ЦК КПСС.

Гэтыя «клопаты» партыі аб «нацыянальным сьвяце» беларускага народу маюць, бязумоўна, немалую палітычную вымову. Прапануючы усяму сьвету сваю «ленінскую» разьвязку нацыянальнага пытаньня, бальшавікі шукаюць нагодаў, каб і навонкі «прадэманстраваць» гэтак званую «перавагу ленінскай нацыянальнай палітыкі» і адначасна заспакоіць нацыянальныя імкненьні нерасейскіх народаў ўнутры СССР. Гэтай мэце маюць служыць і ўспомненыя тэзісы да саракагодзьдзя КПБ. Толькі, на нашую думку, мэты гэтай яны не дасягаюць і дасягнуць ніяк ня могуць. Тэзісы, ня гледзячы на старонную апрацоўку, не змаглі схаваць таго факту, што й кампартыя Беларусі й цэлая БССР бяруць свой пачатак не зь Беларусі й не зьяўляюцца вынікам волі беларускага народу, а становяць сабою чужыя арганізмы, сілай насаджаныя на беларускую глебу. Такое ўражаньне атрымае навет той, хто зь гісторыяй камунізму на Беларусі пазнаёміцца толькі праз «тэзісы».

Немагчына тут зрабіць дакладнейшы агляд гэтага камуністычнага «твору». Абмяжуемся кароткай агульнай характарыстыкай і некаторымі цікавейшымі мамэнтамі.

Тэзісы пачынаюцца паданьнем даты й абставінаў стварэньня БССР і КПБ. Новае ў гэтым магчыма толькі тое, што гэтым разам, VI-ая абласная канфэрэнцыя Расейскай камуністычнай партыі бальшавікоў спачатку абвесьціла пастанову аб стварэньні БССР (фактычна-ж ССРБ), а толькі пасьля назвала сябе першым зьездам КП(б)Б і абвесьціла стварэньне Камуністычнай Партыі (бальшавікоў) Беларусі. Гэта значыць, бяручы фармальна, пастанову аб стварэньні БССР прыймала не кампартыя Беларусі, але расейская камуністычная партыя. Хоць ад пазьнейшага перайменаваньня з «расейскай абласной» у «беларускую» расейская сутнасьць кампартыі на Беларусі нічуць не зьмянілася, прыгаданы вышэй факт вельмі паказальны. Да гэтага мы яшчэ вернемся.

Далей бальшавіцкія ідэялёгі ў сваіх «тэзісах» намагаюцца стварыць грандыёзны абраз разьвіцьця камуністычнага руху на Беларусі перад Кастрычніцкай Рэвалюцыяй і пасьля яе. Гэтым разам яны стараюцца прыменшыць тое, што яны звычайна старанна падкрэсьліваюць пры іншых нагодах, а менавіта, што ў выніку каляніяльнай палітыкі Расеі на Беларусі ня было якіх-небудзь значных індустрыяльных цэнтраў, ня было пралетарыяту, а значыцца ня было й базы для разьвіцьця рэвалюцыйнага руху ў марксысцка-леніньскім значаньні гэтых словаў.

Адзіным рэвалюцыйным рухам, які на Беларусі меў падатны грунт і хутка ахопліваў шырокія пласты насельніцтва, быў беларускі глыбока дэмакратычны нацыянальна-вызвольны рух. І вось на змаганьне супраць беларускай нацыянальнай рэвалюцыі й была скіраваная на Беларусь аснаўная сіла чужых біялягічна й духова бальшавіцкіх арганізацыяў. У «тэзісах» гэта ня ўтойваецца. Гэтак званыя «буржуазныя нацыяналістыя» успамінаюцца там дзе трэба й дзе ня трэба, заўсёды, зразумела, у самых чорных хварбах. Бальшавіцкі дакумант не забыўся й гэтым разам пахваліцца «разгромам», як там пішацца, «гэтак званага Нацыянальнага Ўсебеларускага Кангрэсу», аднак успомніць аб абвешчанай незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі бальшавіцкія пісакі палічылі, відаць, за вельмі небясьпечным.

Вяртаючыся яшчэ раз да мамэнту першага абвешчаньня БССР (гаворым «мамэнт», бо стварэньне «беларускай сацыялістычнай дзяржавы» трывала 2-3 дні, бо яно адбылося на загад з Масквы, а ня ў выніку кансультацыі волі беларускага народу) «тэзісы» адкрыта заяўляюць: «Усе мерапрыемствы па стварэньню Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі праводзіліся па ініцыятыве й пад кіраўніцтвам ЦК РКП(б) (падкрэсьляньне наша — М. К.). Далей: «Так у пяршыню за сваю шматвяковую гісторыю беларускі народ набыў сваю нацыянальную незалежнасьць і дзяржаўнасьць, стаў паўнапраўным гаспадаром свайго жыцьця» (падкрэсьляньне наша — М. К.). А яшчэ далей: «Гістарычнае значаньне 1-га Зьезду КП(б)Б заключалася ў тым, што ён аб'яднаў бальшавіцкія арганізацыі ва ўсебеларускім маштабе й утварыў камуністычную

(Заканчэньне на 4-ай бачыне)

„Прышчэпаўшчына“

Дзейнасьць наркомзема БССР Д. Прышчэпава пачалася ў 1924 годзе, пасьля таго, як да БССР была далучаная Віцебшчына, Магілёўшчына й нязначная частка Смаленшчыны. Гэты час супадае з тым пэрыядам, калі была абвешчана новая эканамічная палітыка ў СССР.

Прышчэпаў меў бяссумлеўныя арганізацыйныя здольнасьці, добра знаў сельскую гаспадарку й жыцьцё беларускага народу. Разбураная войнамі й акупацыямі сельская гаспадарка патрабавала рэформаў, ліквідацыі тых вялікіх крыўдаў, спрычыненых беларускім сялянам пры надзеле іх зямлёй у 1861 годзе. Прышчэпаў паставіў сабе за мэту грунтоўна перабудаваць сельску гаспадарку Беларусі, надзяліць зямлёю безьзямельнае сялянства, зьліквідаваць малазямельле, зьнішчыць вузкапалосіцу, далёкапольле.

Дзеля інтэнсыфікацыі заняпалай сельскай гаспадаркі й стварэньня ўплываў ініцыятыўнай дзейнасьці сельскага двара, Прышчэпаў уважаў неабходным расьсяліць буйныя вёскі на пасёлкі. На ягоную думку ўва ўсіх мерапрыемствах дзяржава павінна дапамагаць сялянству, асабліва спрыяць разьвіцьцю ўсіх відаў каапэрацыі.

Пэўна-ж, зь ведама й дазволу ЦК КП Беларусі Прышчэпаў наведаў Данію й Нямеччыну дзеля азнаямленьня зь сельскай гаспадаркай у гэтых перадавых праінах. Пасьля свайго пабыту на Захадзе ён яшчэ больш пераканаўся ў неабходнасьці ажыцьцяўленьня задуманых плянаў. Ягонымі аднадумнікамі, дараднікамі й супрацоўнікамі былі Гаўрыла Гарэцкі, акадэмік Смоліч, географ і знаўца сялянскага быту Некрашэвіч зь Дзяржпляну, а таксама шмат іншых.

За асноўную форму землякарыстаньня на Беларусі быў прызнаны невялікі пасёлак — 5—7 двароў, зямля якога разьмяшчалася вакол сядзібаў пасялкоўцаў. Уся зямельная плошча пасёлку падзялялася ня менш чым на пяць палеткаў. Сядзібы пасялкоўцаў вызначаліся ў вадным месцы — бліжэй да дарогі выганаў, рэчкі або возера. Кажнаму пасялкоўцу вызначалася каля гэктара пад сядзібу, з мэтай даць яму магчымасьць разьвесьці пры сядзібе сад, гарод, пасеку. Такім чынам, пасялкоўцу давалася магчымасьць выкарыстаць зямлю пры сядзібе паводля свайго густу, разьвіваць на ёй дадатковыя галіны сельскай гаспадаркі.

У першую чаргу неабходна было правесьці земляўпарадкаваньне запаснога фонду — земляў, якія былі раздадзеныя ў часове карыстаньне. А ўжо арганізацыі іх на пасёлкі, прадбачвалася землеўпарадкаваць буйныя вёскі й сёлы. Новая пасялковая форма землекарыстаньня была прыхільна прынятая беларускім сялянствам. Сяляне дапамагалі каморнікам, выконваючы прасьцейшую працу пры інструмантальных здымках зямельных плошчаў. Сялянства навет дабравольна прыймала на сябе частку выдаткаў на ўтрыманьне каморнікаў. Пры дапамозе інструктараў з наркамзему, у вёсках пасьпяхова арганізаваліся розных відаў сельска-гаспадарчыя каапэратывы. У раёнах аграномы закладвалі дасьледчыя дзялянкі. Спэцыялістыя — аграномы, інструктары садоўніцтва, пчалярства былі жаданымі наведвальнікамі ў вёсках.

Навет частковае землеўпарадкаваньне й пераход на шматпольле, дзе для гэтага была магчымасьць — канкрэтныя парады спэцыялістых сельскай гаспадаркі, далі свае вынікі. Валавая прадукцыя сельскай гаспадаркі пад 1927 год перавысіла 1913 год на 12%, а пасяўная плошча павялічылася на 19%.

Ня меншымі былі дасягненьні і ў жывёлагадоўлі. У параўнаньні з 1915 годам буйнай рагатай жывёлы павялічылася на 36,4%, у тым ліку кароў — на 33%, коней — на 15%. Шпарка паднялася й другарадныя галіны сельскай гаспадаркі: садоўніцтва, гародніцтва, пчалярства. Пад садамі было занята 19.100 гэктараў. Агульны збор садавіны ў 1925 годзе дасягнуў 95.965 тонаў, зь якіх 25.908 тонаў высокаякасных яблык антонаўкі й ігрушаў. Слуцкая бэра вывозілася за межы Беларусі.

Хуткае й пасьпяховае аднаўленьне сельскай гаспадаркі Беларусі тлумачыцца перш за ўсё працавітасьцю нашага сялянства, яго прагнасьцяй і цікавасьцяй да ўсяго новага, прагрэсыўнага. Аднак аснаўным стымулам пасьпяховай працы таго часу ў сельскай гаспадарцы была сьведамасьць, што затрачаная праца на зямлі свае гаспадаркі не прападае дарам, а зьяўляецца пэўным сродкам дабрабыту.

Дзеля распаўсюджаньня посьпехаў новае сыстэмы дасягнутых паасобнымі гаспадаркамі, штогод у раённых цэнтрах адбываліся выстаўкі. Яны называліся «Днямі ўраджаю» і ладзіліся пасьля поўнага заканчэньня восенскіх працаў на полі, пад Пакровы. Выстаўкі былі надзвычай цікавымі, із шматлікімі й разнастайнымі экспанатамі. На выстаўцы можна было сустрэць пародзісту жывёлу, якою вельмі была багатая Случчына. На выстаўку сялянкі прывозілі вялізарныя гарбузы, гуркі й іншыя экспанаты, клапатліва выгадаваныя ў сваіх гародах. Паказвалі таксама й садавіну, пахучы ліповы мёд. Ды чаго там ня было?

За лепшыя экспанаты выдаваліся невялікія грашовыя прэміі, або кніжкі на тэмы жывёлагадоўлі, садоўніцтва, гародніцтва, пчалярства й г. д. Аднак найбольшай узнагародай уважаўся дыплём, або пахвальны ліст. Гэтыя ўзнагароды захоўваліся дома ў рамках на пачэсным месцы.

Арганізатарам і душою ўздыму сельскай гаспадаркі ў БССР быў Д. Прышчэ-

(Працяг на 4-ай бачыне)

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

Новы манэўр Хрушчова

Выступленьне Хрушчова на мітынгу польска-савецкай прыязьні ў Маскве 10 лістапада адразу сталася прадметам шматлікіх камэнтароў у сусьветнай прэсе.

Заходняя прэса і ўрады заходніх краінаў зацікаўленыя перш за ўсё тэй часткай прамовы Хрушчова, у якой ён успомніў аб магчымай рэвізіі статусу Бэрліну. Ува ўрадавых колах Англіі, Францыі і Злучаных Штатаў словы Хрушчова аб тым, што «надьйшоў час, каб дзяржавы, якія падпісалі Потсдамскае пагадненьне, адмовіліся ад рэштак акупацыйнага рэжыму ў Бэрліне», разглядаюцца, як пачатак новага наступальнага манэўру савецкага ўраду.

Што азначае гэты новы крок савецкага партыйнага кіраўніцтва? Адказ на гэтае пытаньне трэба шукаць у тэй агульнай характарыстыцы міжнароднага палажэньня, якую даў ў сваёй прамове Хрушчоў, у выступленьні з адказам першаму сакратару Польскай Аб'еднанай Работніцкай Партыі Гамулку, і ў савецка-польскай заяве аб выніках перамоваў у Маскве паміж польскай дэлегацыяй і савецкімі кіраўнікамі.

Галоўнай думкай у гэтых трох дакумантах зьявляецца тэзіс аб узрастаючым «імпэрыялізьме» краінаў Паўночна-Атлянтычнага Пакту і, у прыватнасьці, аб быццам-бы прыймаючай ўсё больш пагражальныя памеры мілітарызацыі Нямецкай Фэдэратыўнай Рэспублікі». Таму, савецкі й польскі ўрады ўважаюць, што надыйшоў час зьвярнуць увагу заходніх краінаў на неабходнасьць знайсьці вырашэньне пытаньня аб эўрапэйскай бясьпецы і — як гаворыць Хрушчоў — «даць магчымасьць стварыць нармальныя ўмовы ў сталіцы ГДР», гэта значыць у Бэрліне. Яны прапануюць падпісаць мірную ўмову зь Нямеччынай.

Усе вельмі добра ведаюць, што ў цьверджаньнях аб неабходнасьці стварэньня сыстэмы эўрапэйскай бясьпекі няма нічога новага. Нічога новага няма таксама ў часта паўтараных фразах аб «імпэрыялізьме», НАТО і «мілітарызацыі» Нямецкай Фэдэратыўнай Рэспублікі.

Тэзіс аб імпэрыялізьме і мілітарызацыі зьвязваецца зь мінулым. Гітлераўскі напад на Польшчу й Савецкі Саюз, сьмерць і цярпеньні, якія гэты напад спрычыніў мільёнам Палякаў, Беларусаў, Жыдоў, Украінцаў, Расейцаў — гэта гістарычны факт. Аб гэтым успомніў у сваёй прамове Гамулка. На гэтым факце, прызнаным усімі, як вялізарнае злачынства ў гісторыі чалавецтва, савецкі ўрад будуе сваю палітыку. Ён выкарыстоўвае гэты факт, каб забясьпечыць сабе поўную падтрымку кіраўніцтва польскай кампартыі — знаючы, што польскі народ асабліва чулы да ўсяго таго, што прыгадвае нямецкую небясьпеку. Трэба падкрэсьліць, што ў сваёй прамове Хрушчоў даў Гамулку зусім выразную гарантыю граніцы на Одры і Нісе. Ён заявіў: «Кожны замах нямецкіх рэваншыстых на ГДР трэба разглядаць як замах на граніцу Одры і Нісы, разглядаць як пагрозу бясьпекі нашых народаў.» Адначасна Хрушчоў яшчэ раз пацьвердзіў, што савецкі ўрад ніколі не адмовіцца падтрымоўваць ўрад Ульбрыхта—Гротэволя. У сваю чаргу Гамулка заявіў: «Бясьпека й сувэрэннасьць Польшчы гарантуецца еднасьцю сацыялістычнага лягеру й непарушнай прыязьняй з Савецкім Саюзам». Такім чынам, наведаньне Савецкага Саюзу польскай дэлегацыяй спрыяла — з пункту гледжаньня савецкага кіраўніцтва — умацаваньню тэй еднасьці, якой так патрабуе гэтак званы сацыялістычны лягер пасьля тых уструсаў, якія ён перанёс у сувязі з падзеямі ў Вугоршчыне і Польшчы два гады таму. Але канчаткова кансалідацыя савецкага блёку магчымая толькі пры ўмове прызнаньня існуючых граніцаў заходнімі краінамі. Якраз таму ўрачыстае абвешчаньне вечнай прыязьні новым кіраўніцтвам польскай кампартыі — кіраўніцтвам, якое прыйшло да ўлады наўсуперак волі ЦК КПСС — супадае з новым палітычным наступам савецкага кіраўніцтва на краіны Паўночна-Атлянтычнага Пакту.

Аналіз прамовы Хрушчова паказвае, што ў сваіх плянах стварэньня гэтак званай «эўрапэйскай сыстэмы бясьпекі», савецкае кіраўніцтва ўпарта адмаўляецца ад таго адзінага мерапыемства, якое зусім неабходнае для стварэньня такой сыстэмы — гэта значыць, ад правядзеньня свабодных, усеагульных выбараў або плебісцыту ўва ўсёй Нямеччыне. Таму зусім відавочна, што савецкае кіраўніцтва імкнецца ня столькі да эўрапэйскай сыстэмы бясьпекі, колькі да ўмацаваньня базы камунізму ў Эўропе. Як заўсёды, яно кіруецца ня інтарэсамі народаў Савецкага Саюзу, але ідэяй пашырэньня камунізму.

Апрача таго, савецкі ўрад мае таксама на думцы і зусім канкрэтныя інтарэсы такіх сьпроў «сацыялістычнага лягеру», як савецкая зона Нямеччыны. Урад Ульбрыхта-Гротэволя, які імкнецца ўмацаваць камуністычны рэжым у савецкай зоне, дамогся-б, папершае, прызнаньня яго з боку заходніх дзяржаваў і, падругое, ліквідацыі таго «вакна ў сьвет», якім зьяўляецца заходні Бэрлін.

Падзелены на зоны, Бэрлін стаўся апошнім часам асабліва нявыгадным з прычыны павялічэньня колькасьці ўцекачоў, якія пераходзяць на Захад праз Бэрлін. Уцёкі навукоўцаў, лекароў, тэхнікаў і моладзі з савецкай зоны дасягнулі такіх памераў, што прадаўжэньне гэтага працэсу стварае рэальную пагрозу для эканамічнага жыцьця краіны.

Яшчэ няведама, як будзе разьвівацца палітычная кампанія, пачатая цяпер савецкім урадам. Рэакцыя на прамову Хрушчова ўва ўрадавых колах заходніх краінаў паказвае, што кажная спроба парушыць існуючыя ўмовы прывядзе да паважнага міжнароднага канфлікту.

Р. В.

З радыёвай хвалі «Вызваленьне»

Выгубленыя бальшавікамі - I

Табе, Народ мой, згібнуты ў ваковах,
З-пад сэрца песьню гутую пяю,
І, ускрашаючы мінуўшчыну нанова,
Выказваю цяпершчыну тваю...

Янка Купала

✳

У юбілеі БССР рэжым вымагае сабе постаці нацыянальнага дабродзея, патрона Беларусі. Таму ўгодкі называюць не абы як, а нацыянальным сьвятам. Узвышаны назоў спатрэбіўся дзеля прапагандовага рэвэрансу на адрыс народу. А галоўнае, каб прыкрыць ім палітыку фізычнага выгубленьня і духовага тэрору. Гэткай палітыкай чатыры дзесяцігодзьдзі дамагаліся ўсё яшчэ недасягнутае даўнае мэты — выканчэньня ў народзе нацыянальнае самасьведамасьці.

У гісторыю Беларусі бальшавікі ўварваліся чужацкай збройнай сілаю. Ужо ад першага сутыку з нашым адраджэнчым рухам яны выявіліся зацятымі ягонымі ворагамі, навет калі яшчэ ня мелі ўлады. А захапіўшы яе, распачалі сваю дзейнасьць разгонамі, арыштамі, забаронамі, пагвалчаньнем народных традыцыяў і правоў. У 17-ым годзе разагналі 1-ы Ўсебеларускі Кангрэс і абвесьцілі забароненымі нацыянальныя арганізацыі. Яны зьнішчылі народжаную нашай нацыянальнай рэвалюцыяй у 1918 годзе Беларускую Народную Рэспубліку. У 20-ым годзе здушылі Слуцкае паўстаньне, удзельнікі якога змагаліся за адваёў адабранае дзяржаўнасьці.

Напярэдадні 30-х гадоў, што засталіся ў народнай памяці змрочным ліхалецьцем, малады паэт Тодар Кляшторны, якога пазьней зьняволілі ў канцэнтрацыйным лягеры, пісаў:

Ходзім мы пад месяцам высокім,
А яшчэ —

пад ДПУ.

Сыгналам для тэрарыстычнага наступу стаўся абвешчаны ў 29-ым годзе, на 13-ым зьезьдзе КПБ, лёзунг — «нацыянал-дэмакратызм зьяўляецца галоўнай небясьпекай». Ужо ўлетку 30-га году распачаліся масавыя арышты самае творчадзейнае інтэлігенцыі, носьбітаў незалежнае думкі, пастрашліва абзываных ворагамі народу. За кратамі апынуліся выдатныя пісьменьнікі, настаўнікі, навуковыя й грамадзкія дзеячы. Каб апраўдаць ды яшчэ больш узмоцніць тэрор-мабілізавалі гэтак званую грамадзкасьць. Яна, адпаведна дырэктыве, адно й патрабавала: вынішчыць. Дзеля змайстраваньня паказальнага працэсу на загад маскоўскага ГПУ у менскіх ягоных канцылярыях хвабрыкавалі няіснаваўшую нелегальную арганізацыю пад назовай «Саюз вызваленьня Беларусі». Перашкодаю зладзіць працэс зьявіўся трыманы й дасяньня ў глыбокай тайніцы пратэстацыйны замах на сваё жыцьцё арыштаванага Янкі Купалы. Перашкодзіла таксама самагубства прэзыдента Беларускае Акадэміі Навук акадэміка Ўсевалада Ігнатоўскага, якому прызначалі кіроўную ролю ў праектаваным з правакацыйнымі мэтамі «саюзе вызваленьня».

Па чароднай хвалі арыштаў 30-га году нахлынула жахліва вынішчальная яжоўшчына. Тэрор ахапіў усе дзялянкі жыцьця. Сябры, разьвітваючыся ўвечары, ня мелі надзеі на сустрэчу раніцай. Чалавечы лёс абрываўся ў катоўнях НКВД. Дарэшты апусьцелі ўжо аголеным перад гэтым менскі Дом пісьменьнікаў, Акадэмія Навук, розныя іншыя навуковыя й навучальныя ўстановы, грамадзкія арганізацыі. Тады былі зьвінавачаныя ў польскім шпіянажы й вынішчаныя ўдзельнікі партызанкі 20-га году. Якую безьліч людзей расстрэльвалі, відаць навет з патайнага пратаколу прысланай у Менск па ліквідацыі Яжова «кантрольнае камісіі». Толькі на падставе актаў НКВД БССР, трыманых у Менску, камісія вымушаная была прызнаць бясспрычыннымі больш за трынадцаць тысяч расстрэлаў.

Выгублялі бальшавікі інтэлігенцыю ня толькі ў БССР. Каб адабраць правадырства ад нацыянальнага руху ў заходняй Беларусі ў часе польскае акупацыі яны ўсялякімі спосабамі вабілі інтэлігенцыю ў БССР, аблыжна называную «беларускім домам». А пасьля зьнішчалі, заўсёды зьвінавачваючы ў тым-жа польскім шпіянажы. Разам з далучэньнем да БССР заходняе Беларусі паўтарыліся й там масавыя дэпартацыі.

Тэрор, фізычны й духовы, заўсёды апраўдвалі й апраўдваюць адным росчыркам пяра — «змаганьне з буржуазнай нацыяналістычнай контррэвалюцыяй». А носьбітамі прыпісанае буржуазнасьці сталіся вылучна выхадцы з гушчаў працоўнага народу, аборонцы ягоных інтарэсаў. Прыклады народагубства, у якім бальшавізм паўстае ў сваёй запраўднай постаці, можна прыводзіць бясконца. Імі поўніцца ўся гісторыя БССР.

Аглядальнік

(Заканчэньне на 3-яй бачыне)

Зь гісторыі газэты „Савецкая Беларусь"

Газэта «Літаратура і мастацтва» ад 15-га кастрычніка гэтага году зьмясьціла артыкул Камінскага пра першыя беларускія савецкія газэты ў Менску ў 1920-ым годзе. Гаворячы пра газэту «Савецкая Беларусь», аўтар піша, што яна ад 15-га жніўня 1920 г. **«пачала** выходзіць на беларускай мове». (Перад гэтым некалькі нумароў яе выйшла парасейску). Восьжа калі-б гісторык Камінскі меў права пісаць праўду, ён мусіў-бы напісаць, што «Савецкая Беларусь» у жніўні 20-га году «пачала выходзіць **ізноў»** пабеларуску, дзеля таго, што газэта выдавалася пабеларуску перад тым, як яе пачалі друкаваць у расейскай мове. Ейным рэдактарам быў, закатаваны пазьней бальшавікамі, старшыня першага беларускага савецкага ўраду Зьмітра Жылуновіч, ведамы ў нашай літаратуры пад псэўдонімам Цішкі Гартнага.

Сяньняшнім валадаром Беларусі небясьпечна ўспамінаць пра некаторыя факты зь біяграфіі бальшавізму на нашых землях. Асабліва што іх трывожыць — гэта праўда аб наважным змаганьні беларускага народу за сваю дзяржаўнасьць. У газэце «Савецкая Беларусь» Цішкі Гартнага надта-ж шмат гэткіх фактаў, хоць і насьветліваных з чыста бальшавіцкага гледзішча.

Возьмем дзеля прыкладу нумар 3-ці «Савецкае Беларусі» ад 3-га сакавіка 1920 году. Перадавіца гэтага нумару пад праграмным загалоўкам «Нашы задачы» зусім выразна пярэчыць сяньняшнім цьверджаньням савецкіх гісторыкаў, што быццам у 1920 годзе «найлепшыя сыны беларускага народу ў радох камуністычнай партыі ахвярна й актыўна змагаліся за савецкую ўладу.» А вось што пісала «Савецкая Беларусь» у тыя часы на гэтую тэму у сваёй перадавіцы:

«... Кіраўнічыя камуністы з гарадоў Беларусі выехалі ў Савецкую Расею, многія зь сялянскіх працоўнікаў сядзяць па вастрогах, але многія сотні зь сялянскіх бальшавіцкіх працоўнікаў, як партыйных, гэтак і савецкіх, асталіся на мейстах; яны раскіданы, ні ведаюць да каго зьвярнуцца за ўказкамі, ад каго дастаць весткі аб Савецкай Расеі, аб хадзьбе рэвалюцыі.

«З-за гэтага першаю нашаю задачаю ў цяперашні час ёсьцека — сабраць усе распыленыя сілы... Кожны асобны бальшавік павінен ведаць, што яго абавязак знайсьці другіх, згуртаваць гурток, шукаць зьвязку з суседнімі вёскамі і паветавым горадам.

«Пачатак у арганізацыі, — пісала «Савецкая Беларусь» у сакавіку 20 г., — павінен ісьці зь нізу, работнікі на мейстах ні павінны чакаць, покуль іх знайдуць і прыцягнуць да працы, яны самі павінны выказваць сябе, рухаць»...

Гэты малюнак апатыі, распыленьня й нястачы ўсякае мэтанакіраванасьці сярод нялічных беларускіх бальшавікоў, пакінутых сваімі кіраўнікамі, патрыятычна называецца цяпер «энтузіязмам беларускага народу ў змаганьні за савецкую ўладу».

У іншым месцы таго-ж нумару «Савецкае Беларусі» за 20-ы год гаворыцца пра кіраўніка беларускіх антыбальшавіцкіх паўстанцаў Семянюка, які бараніў Беларускую Народную Рэспубліку. «Савецкая Беларусь», цытуючы беларускую незалежніцкую газэту «Беларускае Жыцьцё» пісала:

«Семянюк зь людзей, каторыя, ні хочучы іці ў чырвоную армію, уцяклі ў лясы, арганізаваў паўстанскі ‚зялёны аддзел'... Ён захапіў ў бальшавікоў тры воласьці: Халопенецкую, Красналуцкую і Зачысьцянскую, гдзе забраў усю бальшавіцкую маемасьць».

Далей у тым-жа нумары «Савецкае Беларусі» ад 3-га сакавіка 1920 году зьмешчана гэткая вестка, якое сяньня ніякі гісторык не адважыцца вынесьці на дзённае сьвятло. Вось ейны поўны тэкст:

«У Беларусі паўсюдах закладваюцца арганізацыі моладзі, вядомыя пад назовай — «скаўтаў», у каторых моладзь вучаць шанаваць бружуазны парадак і ненавідзець работніцка-сялянскую рэвалюцыю.

15—16-га лютога ў Менску быў зьезд скаўтаў Беларусі».

Аляксей Кулакоўскі

ДАБРАСЕЛЬЦЫ 13)

Сумнай, заклапочанай ішла пад вечар дзяўчына ў Чырвоныя макі, на партыйны сход. Каля могілкаў спынілася. Мінулай ноччу й цяпер удзень сьнегу ня было, навет сьляды ўчарашнія былі відны на цаліне. Сярод бярэзьніку жаўцела Васілёва магілка; здалёк яна выглядала маленькай, нібы дзіцячай. Даша паціху прайшла яшчэ некалькі крокаў па дарозе. Вось тут, на гэтым мейсцы ўчора яна спаткала Валодзю. Не знайшла ў сабе сілы сказаць яму хоць адно слова, а сёньня сэрца баліць ад гэтага. Можа ён падумаў, што вінавата, калі маўчала...

XVI

Сход не зацягнуўся вельмі надоўга, хоць і разьвязваліся даволі складаныя пытаньні. За гэта камуністыя й кандыдаты ў сябры партыі маглі-б падзякаваць Ільлі Савічу. Сакратар тэрытарыяльнай партыйнай арганізацыі не ленаваўся схадзіць да камуністага й за пяць-шэсьць кілямэтраў, калі яму трэба было зь ім параіцца ці што-небудзь абмеркаваць. Таму на сходах ня было лішняй гаворкі й непатрэбнай блытаніны.

Даша выходзіла апошняй із школы. На вуліцы было цемнавата, хоць ува ўсіх хатах яшчэ гарэлі агні. Падумалася аб тым, што ня надта весела будзе йсьці ноччу адной, але ў гэты час выйшаў на школьны ганак Ільля Савіч.

— Гэта паліто заходзіў накінуць, — тонам апраўданьня загаварыў ён, — а так я ўсяроўна меў на ўвазе прайсьці з вамі. Папершае, правесьці крыху, каб ня так вам было страшна, а падругое, — гаворка яшчэ адна ў мяне ёсьць.

— Добра, Ілья Савіч, — ціха адказала Даша.

— Скажыце, — адразу пачаў дырэктар, — Міхась ня прыслаў вам на гэтых днях пісьма?

— Учора прыслаў, — зь цікавасьцяй да гэтага пытаньня адказала дзяўчына.

— А што ён піша? Прабачце, калі ласка, за маю нясьціпласьць.

— Піша, што вось-вось прыедзе дадому, — ахвотна паведаміла Даша. Толькі невядома, у адпачынак ці ў камандыроўку ў наш раён.

— Ні ў адпачынак, ні ў камандыроўку, — паважна сказаў Ільля Савіч. — Я таксама атрымаў ад яго пісьмо. Мы ўсё-такі зь ім даўнія сябры. Будзе працаваць тут Міхась.

— Як гэта? — зьдзівілася Даша. — Тут, у нашым калгасе?

— Думаю, што ў нашым, — пацьвердзіў дырэктар. — І ў райкоме партыі гэтак-жа думаюць. Мы разам з сакратаром райкому й пісалі Міхасю.

«Вось чаму бацька з Платонам так узрадаваліся ўчора, — падумала Даша. — Няўжо яны ведалі што-небудзь пра гэта? А можа проста адчуваньне ў старых сваесаблівае».

Для самой-жа Дашы гэтая навіна была пакуль-што нечаканай, хоць яна даўно ведала, што брат, як аграном, не задаволены сваёй работай у міністэрстве, што яго ўвесь час вабяць прасторы палёў і сенажацяў. З другога-ж боку, яна бачыла й не адзін раз гаварыла на сходах, што Шулаў — ніякі не старшыня, хоць і чалавек ён спакойны, памяркоўны, што яго даўно трэба выправадзіць туды, адкуль ён прыехаў, інакш гаспадарка сядзе макам. Але ніколі яна ня думала, каб Міхась згадзіўся стаць у Дабрасельцах старшынёю. Невядома, чаго тут бацька ўзрадаваўся. Зразумела, радасна было-б, каб зьявіўся нарэшце добры старшыня калгасу ды памог людзям пазапраўднаму стаць на ногі. Яшчэ больш уцешна было-б для бацькі, каб гэтым чалавекам аказаўся яго сын. Прыемна гэта й для сястры.

— Можа, у МТС яго прысылаюць? — нерашуча спытала Даша. — Туды, я чула, трэба аграном.

Ёй няёмка было выказаць свае думкі ўслых, бо ў душы яна разумела нягрунтоўнасьць свайго зьдзіўленьня й ведала, што яно хутка пройдзе. Бацька тут лепш адчуў як яна.

— Ён сам згадзіўся прыехаць у калгас, — нібы зразумеўшы думкі, сказаў Ільля Савіч. — Паверце, што ніхто на яго, як кажуць, не націскаў і ніхто ня выжываў зь міністэрства. Зямля — яго стыхія, усяроўна, як мая — школа. Тут я яго вельмі добра разумею. Ня зьдзіўляйцеся, Даша, — будзе Міхась у Дабрасельцах старшынём. Ведаю, што вам нязручна, дык я сам пагавару з калгасьнікамі, мяркую, што яны не адмовяцца ад свайго земляка. І яшчэ раз — ня зьдзіўляйцеся...

Тут Ільля Савіч перапыніўся й нейкі час ішоў моўчкі, нібы абдумоўваючы, зь якога слова пачаць, як зрабіць размову найбольш пераканаўчай. Даша чакала, стрымліваючы глыбокае хваляваньне.

— Вы, пэўна, заўважылі навет зь сяньняшняга сходу, — ціха загаварыў дырэктар, — што вас камуністыя паважаюць, падтрымалі вас у гэтай нялёгкай справе й вось у сябры партыі прынялі. Прычым — аднагалосна. Я радуюся гэтаму разам з вамі й яшчэ раз ад душы віншую вас.

— Шчыра дзякую, — ледзь вымавіла ад хваляваньня Даша.

— Паважаюць вас за работу, вядома, за прынцыповасьць. І вось, ня ведаю, як усе дэпутаты, а мы, камуністыя параіўшыся між сабою, рашылі прапанаваць сэсіі вашу кандыдатуру на старшыню сельсавету.

— Што вы, Ільля Савіч! — ледзь ня крыкнула Даша. — Што вы гаворыце! Я ня спраўлюся, ды й ня выбяруць мяне. Аб гэтым і думаць няма чаго. Я сама дам сабе адвод, або навет і на сэсію ня прыйду!

— Я таму й прызнаўся вам у нашых намерах, — працягваў свае довады Ільля Савіч, — каб вы мелі магчымасьць усё гэта добра абдумаць і падрыхтавацца да гэтага. А калі ўдумаецеся, то самі ўбачыца, што гэта самы лепшы варыянт. І адмаўляцца вам няма чаго.

— Навет і ня думаючы многа, можна сказаць, — не адступала Даша,- што гэта зусім не для мяне. Папершае, глядзіце, што выходзіць: Міхась — старшыня калгасу, а я — старшыня сельсавету. У ваднэй хаце два старшыні. Як гэта можа быць? А потым яшчэ вось што: увесь час я выступала супраць Мокрута, крытыкавала яго, а цяпер людзі скажуць, што я яго мейсца дамагалася. Не, Ільля Савіч! Мне вельмі радасна, што вы так хораша думаеце пра мяне; сяньня запраўды такі дзень для мяне, што ніколі не забудзеш: і гора столькі было, і радасьці. Але прапановы такой ня ўносьце. Яшчэ глядзіце, што й Мокрут застанецца. У яго ёсьць падтрымка ў раёне.

— Паспрабую адказаць па пунктах, — стрымана ўсьміхнуўшыся, прамовіў дырэктар. — У Чырвонамакаўскім сельсавеце не адзін Дабрасельскі калгас, а цэлых чатыры. Затым у сельсавеце, як вядома, ёсьць яшчэ школа, каапэратыў, мэдпункт. Так што брат і сястра ня будуць заўсёды хадзіць па аднэй і той-жа сьцежцы. Што-ж датычыць залішняга шчасьця ў ваднэй сям'і, то няхай былы бядняк і франтавік грамадзянскай вайны Мітрафан мае й двух старшынь у сваёй хаце. Ні-

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

Сьв. Пам. Адварды Будзька

(з дакладу др-а Жука, 19. 10. у З. Б. К. у Тароньце)

14 жніўня г. г. у Чыкага памёр ведамы беларускі дзеяч Адварды Будзька. Гэтая сьмерць прынясла беларускай справе вялікую страту ў агульна-нацыянальным засягу, бо шматгадовая дзейнасьць нябошчыка была зьвязана з нашым нацыянальным і вызвольным рухам.

Адварды належыў да піянэраў беларускага руху. Радзіўся ў 1882 годзе ў мястэчку Будславе Вялейскага павету. Быў равесьнікам Янкі Купалы й Якуба Коласа, зь якімі супрацоўнічаў у «Нашай Ніве», але быў старэйшым нашаніўцам і належыў да старэйшых беларускіх дзеячоў. Ён быў актыўным Беларусам перад 1905 годам, ужо ў 1901 годзе зарганізаваў беларускую калёнію ў Рызе.

Жыцьцёвы шлях нябошчыка быў нялёгкі, хоць гэтага па ім і ня было відаць: заўсёды жывы й рухлівы, энэргічны, з новымі ідэямі й сьмелымі праектамі й плянамі — ён ніколі ня скардзіўся на свой лёс, а заўсёды шукаў чагось новага, заўсёды йшоў наперад. З пачатковай асьветай пакінуў родны Будслаў, пайшоў у шырокі сьвет у раньняй моладасьці. І ня згубіўся. Ня толькі здабыў асьвету самаадукацыяй і знайшоў сабе мейсца ў жыцьці, але й выцягнуў у людзі й спрычыніўся да адукацыі шматлікіх Беларусаў, каб працавалі, як ён сам, для свайго народу. Ягоная-ж дзейнасьць у беларускім жыцьці была такая разнастайная, што здаецца няма дзялянкі, да якой ён ня прылажыў свае рукі. Ён — грамадзкі дзеяч і арганізатар, пашыральнік беларускай сьведамасьці, кніжкі й газэты, публіцыст, рэдактар-выдавец беларускай газэты «Дзяньніца» ў Петраградзе ў 1916 годзе, а ў 1920 — «Беларускай Думкі» ў Вільні. Ён займаўся рознымі сялянскімі справамі й гаспадарчымі, арганізоўваў каапэратывы й выбіўся на аднаго з найлепшых каапэратараў на Беларусі. Пазьней каапэрацыі ўдзяляўся найбольш, працаваў у гэтай дзялянцы да вайны 1939 году. У каапэратывы ён нёс ня толькі фаховую параду, але й беларуску кніжку й газэту — нацыянальную сьведамасьць. Сам аўтар гэтага дакладу ўжо ў 1912 годзе навучыўся чытаць пабеларуску на «Беларускім календары» і нумарох «Нашай Нівы», якія трапілі ў ягоныя рукі дзякуючы Адварду Будзьку.

Калі ў часе першай сьветавой вайны масы Беларусаў эвакуюцца ў Расею й рассыпаюцца па яе абшары, Адварды Будзька адным зь першых ідзе ім на спатканьне з маральнай і матар'яльнай дапамогай, закладаючы «Беларускі Камітэт Пацярпеўшым ад Вайны». Дзякуючы гэтаму Камітэту Беларусы ў Расеі трымаюць сувязь із сваім нацыянальным рухам і бяруць удзел у важных падзеях у часе Расейскай рэвалюцыі й пазьней.

Дзейнасьць Адварда Будзькі не абмяжоўваецца да якойсь аднэй мясцовасьці, што праўда, найбольш праяўляецца ў Вільне, Рызе, Патраградзе й Будславе, дзе ён найбольш прабываў, але прамяшае й у іншых пунктах на Беларусі й за ейнымі межамі — ці то ў Менску й меншых беларускіх асяродзьдзях, ці то ў Бэрліне, Коўне, Дзьвінску й на эміграцыі. Таму імя Адварда Будзькі было ўсюды ведамым і папулярным.

Ён адчуваў сваёй душою ўсе патрэбы беларускага руху. Зьяўляўся там, дзе гэтыя патрэбы выступалі найвастрэй. Браўся за тое, што ў даную хвіліну, у даных абставінах было найбольш неабходным, найбольш пякучым. Вычуваў ён гэта з надзвычайным зразуменьнем і сьмела й рашуча прыступаў да дзеяньня. І нішто, здавалася, не магло стрымаць ягонай дзейнасьці. Калі ў 1921 годзе Палякі выкінулі яго ў ліку 33 Беларусаў і Летувісаў зь Вільні ў Летуву, ён праяўляе сваю беларускую дзейнасьць спачатку ў Коўне, а пазьней у Дзьвінску.

* * *

Нябошчык пакінуў таксама вялікі сьлед у змаганьні за беларускую школу. Браў удзел у арганізацыі беларускіх пачатковых школ, быў кіраўніком беларускіх настаўніцкіх курсаў у Дзьвінску, але найбольш праявіў сябе ў гэтай дзялянцы пры арганізацыі Беларускай Гімназіі ў Будславе. Было гэта ў 1917—1919 гадах.

Беларуская нацыянальная сьведамасьць у Будславе й ваколіцах дзякуючы Адварду Будзьку даўно ўжо запусьціла глыбокія карані. Нядаўная рэвалюцыя стварыла спрыяльныя абставіны да гэтага, аднак патрэбна была ініцыятыва, актыўнасьць і ахвярнасьць, каб арганізаваць беларускае школьніцтва. Але Адварды Будзька не задавальняецца пачаткавай школай. Ён адразу сягае па сярэднюю. Калі ўзяць пад увагу, што Будстлаў — гэта невялікае мястэчка (каля 1000 жахароў), паложанае далёка ад большых местаў і што не магло марыць дагэтуль аб чатырохклясовай школе гарадзкога тыпу — дык плян заснаваньня тут беларускай гімназіі выглядаў занадта сьмелым. У Будславе ня было ані адпаведнага будынку для гімназіі, ні вучыцялёў, ані сяродкаў на абсталяваньне, на кнігі ды школьныя прылады. Праўда, Будслаў з ваколіцамі меў каталіцкае насельніцтва, якое не зачапіла русыфікацыя, а палянізацыя праз касьцёл і двор кранула павярхоўна толькі некалькі трацьціярак ды нялічных панскіх служак. Нацыянальная сьведамасьць і цяга да асьветы, як было ўжо сказана, была значная, аднак нікому ў голаў і ня прышло, што трэба пачынаць адразу зь гімназіі; людзі не разумелі патрэбы й значаньня такой школы — ды некаторыя навет слова «гімназія» блыталі з словам «гімнастыка». Таму шмат якія будслаўцы гаварылі, што няма тут падрыхтаванага грунту пад гімназію. Гэта была восень 1917 году, ад лютаўскай рэвалюцыі прайшло толькі некалькі месяцаў, якія не маглі згладзіць цемнату й безпрасьвецьце створанае расейскай рэакцыйнай палітыкай за амаль паўтара стагодзьдзя. Аднак Адварды Будзька не пабаяўся ўсіх гэтых цяжкасьцяў, бо ён ведаў, чаго хацеў, ведаў чаму ў Будславе трэба адкрыць беларускую гімназію. Ён знаў, што Беларусам патрэбна перадусім інтэлігэнцыя, якой тады было так мала, — пры тым інтэлігэнцыя сялянская, зь нетраў народу. Аб сярэдніх школах у большых мястэчках было каму паклапаціцца, але гэтыя школы для сялянства былі мала даступныя. Таму зусім слушна ён уважаў, што трэба тварыць беларускія сярэднія школы для сялянства ў самай гушчы вясковых асярдзьдзяў. Будслаў-жа быў ідэальным мейсцам для гэтай мэты.

Наш слаўны дзеяч умеў выбіраць адпаведныя мамэнты дзеля правядзеньня сваіх сьмелых плянаў, — а восень 1917 году была вельмі адпаведным часам дзеля арганізацыі беларускіх школ. Рэвалюцыя была яшчэ ў руху, Керанскі тросься, адбываўся бальшавіцкі пераварот ды й Немцы былі недалёка. У сталіцы Беларусі йшла гарачая арганізацыйная работа, крышталізавалася ідэя незалежнасьці, але ня было яшчэ рашучасьці замацаваньня сваей беларускай улады. Намінальна прызнавалася па энэрцыі расейская ўлада, якая была тады ў зьменнай стадыі й асаблівай эфэктыўнасьці на Беларусі не праяўляла. Аднак сытуацыя магла зьмяніцца ці то з узмацненьнем тэй ці іншай расейскай улады, ці то з прыходам Немцаў. Таму трэба было лавіць мамэнт, каб стварыць дакананы факт ня просячы нічыёй ласкі, ці канцэсіі. І вучыцялёў цяпер было знайсьці лягчэй, бо з галодных гарадоў уся інтэлігэнцыя ехала на заможную хлебам вёску. Цяжка было процістаўіцца гэтым аргумантам, яны пераканалі й тых, што ня верылі ў магчымасьць заснаваньня гімназіі, і тых, што не разумелі патрэбы яе. Выявілася гэта на агульным сходзе бацькоў у Будславе, якіх Адварды Будзька пераканаў у патрэбе арганізацыі беларускай гімназіі ды збудзіў іх энтузіязм да дзеяньня. Ён умеў гаварыць зь сялянамі, умеў пераконваць іх, а найважнейшае — меў іх давер, быў сваім чалавекам і не аднаму памог у нягодзе, ды быў добрай радай, не аднаму памог вызваліцца з акупанцкіх арыштаў.

Пасьля сходу работа загула. Быў створаны адмысловы камітэт, які пачаў зьбіраць грошы на гімназію, рыхтаваць клясы ў быўшай прыхадзкой школе й будынку воласьці ды ўпарадкоўваць абсталяваньне. Адварды Будзька заняўся шуканьнем вучыцялёў. На дырэктара быў запрошаны ведамы археолаг Васілевіч, які скончыў два факультэты ў Маскве й паходзіў зь вёскі Пузыры 7 км. ад Будслава. Была запрошана група вучыцялёў, у якой была родная сястра А. Будзькі й шмат каму ведамы на эміграцыі с. п. Мікола Шыла. Падручнікі й школьныя прылады былі прывезены зь Менску. Адварды Будзька бываў тады часта ў беларускай сталіцы. І хоць аддаваў свае сілы на арганізацыю Беларускай Гімназіі ў Будславе — не занядбоўваў і буйнага тады арганізацыйнага жыцьця ў Менску. Браў удзел ува ўсіх важнейшых беларускіх канфэрэнцыях і зьездах, уключна зь Першым Усебеларускім Кангрэсам.

Камітэт вырашыў на пачатак адчыніць тры гімназіяльныя клясы й дзьве пачатковыя. Заняткі мелі распачацца па новым 1918 годзе. Распачаліся яны дзесь у сярэдзіне студзеня таго-ж году.

У сакавіку 1918 году прыйшлі Немцы. Гімназія з азначанымі вышэй клясамі працавала ўжо поўнай парай. Дакананы факт застаўся фактам. Немцы не рабілі ніякіх перашкодаў у працы Гімназіі. Ім было прыемна, што ў гімназіі выкладаецца нямецкая мова. Пацьвердзілі гэта нямецкія афіцэры, што час-ад-часу наведвалі лекцыі нямецкай мовы. Ад нямецкіх уладаў удалося навет здабыць грашовую дапамогу на Гімназію.

Нямецкая акупацыя прынясла магчымасьць навязаньня сувязі зь Вільняй, якая была перарвана фронтам ад 1916 году. Віленскае беларускае асяродзьдзе дало Будслаўскай Гімназіі маральнае падтрыманьне й свае ўплывы. Наагул пэрспэктывы для Гімназіі былі вельмі добрыя. Трэба было думаць аб далейшым этапе, а перадусім аб адпаведным будынку для Гімназіі. Як фаховая сіла дзеля гэтага быў запрошаны ведамы беларускі архітэкт, с. п. інж. Дубякоўскі. Ён прыехаў у Будслаў і апрацаваў плян двухпавярховага драўлянага будынку для Гімназіі. Будслаўскія сяляне аддалі пад пляц для Гімназіі адрэзкі шнуроў, што даходзілі да вуліцы, на якой мела знаходзіцца Гімназія. Агульны сход бацькоў пастанавіў, каб бацькі апрача аплаты за навуку, адпрацавалі па два дні ад кажнага вучня пры будоўлі Гімназіі, ці то пры вывазцы дрэва й каменьня — для тых, што мелі коней, ці то ручной працай — для мяшчан, што ня мелі коней. І тут работа загула. Яна стрымана была часова толькі выступам мясцовага абшарніка перад нямецкай уладай, якой ён злажыў скаргу на будслаўцаў, што самавольна высеклі бярвеньне на Гімназію ў ягоным лесе. Але праз пару месяцаў Немцы адыйшлі на Захад, а за імі выехаў і пан Оскерка.

Новы 1918/19 школьны год распачаўся нармальна ў верасьні, ужо з чатырмя гімназіяльнымі клясамі й дзьвюма пачаткавымі. Навука трывала дзевяць з палавінай месяцаў. Наплыў вучняў быў такі вялікі, што ня было дзе іх зьмясьціць. Ува ўсіх чынных клясах налічвалася панад 350 вучняў. Засяг абшару, зь якога яны паходзілі, даходзіў да 30 км. радыюсам вакол Будслава. А што-ж было-б, калі-б Гімназія дайшла да поўнага складу 8 кляс, Запраўды тут створана была кузьня беларускай сялянскай інтэлігэнцыі.

Восеньню паказаліся бальшавікі. Яны тады былі яшчэ ў стадыі арганізацыі й не зрабілі вялікіх зьменаў у жыцьці Будслава. Загадалі толькі, каб Гімназія фармальна называлася трудавой школай. Тым часам будынак гімназіі хутка вырастаў. Былі ўжо выведзены сьцены першага паверху. Тут паявіўся надзвычайны высілак будслаўскага сялянства ды арганізацыйныя здольнасьці Гімназіяльнага Камітэту. Зразумела, што за ўсім гэтым, як кіраўнік і інсьпіратар стаяў А. Будзька.

Лета 1919 году прынясло благія навіны. Урад БНР і ягоны апарат акупанты-бальшавікі й Палякі змусілі эміграваць, ды пачалі вайну між сабой за жывое цела Беларусі. Будслаў апынуўся ў засягу ваенных апэрацыяў і трывожна глядзеў на будучыню. З усяго відаць было, што прыдзецца паспытаць новай акупацыі — польскай, ад якой Беларусы нічога добрага не спадзяваліся. Ведамым было, што з Палякамі вернуцца ўсе мясцовыя паны й паўпанкі, што так моцна даліся сялянству ў знакі ў часе нямецкай акупацыі.

Палякі прыйшлі пад восень. Адчуў іх найбалючай Будслаў. Будслаўская Беларуская Гімназія была зачыненая. Дошка з гэтым надпісам была зьнятая з школьнага будынку за пару тыдняў перад пачаткам школьнага году.

Будслаўская Беларуская Гімназія праіснавала паўтара года, але за гэты час у існуючых клясах была прароблена праграма двух гадоў. Ускалыхнула цэлым паветам. Пасьля закрыцьця Гімназіі вучні разыйшліся па сваіх хатах з жалем на чужую ўладу, што зачыніла ім дарогу да асьветы. Але панесьлі з сабою беларускую кніжку, беларускую песьню, беларускую нацыянальную ідэю. Шматлікія зь іх, засмакаваўшы духовай стравы ў Гімназіі — не маглі ўжо безь яе абыходзіцца, яны пайшлі ў шырокі сьвет, у пагоні за асьветай і здабылі яе. І тут не аднаму дапамог Адварды Будзька. Да вынікаў уплыву коратка йснаваўшай Будслаўскай Беларускай Гімназіі трэба залічыць і той факт, што пазьней пад Польшчай — аж да 1939 году Будслаў мей вялікую колькасьць моладзі, што вучылася ў розных школах — сярэдніх і вышэйшых.

* * *

Дзеля паўнаты вобразу варта кінуць вокам і на пазашкольнае жыцьцё ў Будславе ў часе йснаваньня Гімназіі. Як і трэба было спадзявацца, Гімназія зрабіла ўплыў на ўсё насельніцтва, а перадусім на моладзь у пазашкольным веку. Шматлікія дзяцюкі й дзяўчаты вучыліся на агульна-асьветных курсах пры Гімназіі. Гімназія ладзіла беларускія пастаноўкі, канцэрты й вечарыны. Вучні выдавалі на сапіраграфе свой часапіс «Сьветач». Дырэктар і вучыцялі чыталі публічныя лекцыі для ўсяго насельніцтва. Моладзь пазашкольнага веку арганізавала свой клюб «Вяночак», бібліятэку, хор, струнны аркестр і драматычны гурток. Культурнае жыцьцё ў Будславе біла поўнай крыніцай. Кажную нядзелю ладзіўся беларускі спэктакль ці канцэрт. У часе-ж прынагодных збо-

(Заканчэньне на 4-ай бачыне)

ЗЬ ГІСТОРЫІ ГАЗЭТЫ «САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ»

(Заканчэньне з 2-ой бачыны)

Пра ўсе гэтыя й падобныя да іх факты, мноства якіх сустракаецца на балонках першых нумароў «Савецкай Беларусі» гісторыкі беларускага савецкага друку цяпер маўчаць, стараючыся скараціць гісторыю, каб ня даць магчымасьці сяньняшняму чытачу даведацца ўсю праўду пра падзеі тых часоў. Бальшавікам напярэдадні 40-годзьдзя БССР трэба зацерці сьляды таго гвалту, пры дапамозе якога яны здушылі імкненьні беларускага народу жыць у сваёй вольнай Беларускай Народнай Рэспубліцы, абвешчанай 25-га сакавіка 1918 году.

А. Б-ч

чога кепскага ў гэтым няма. Абы толькі людзям была ад гэтага карысьць.

Не магу я прыняць вашу думку й наконт Мокрутавага крэсла. Разумныя людзі ніколі ня скажуць, што вы крытыкавалі Мокрута для таго, каб заняць яго мейсца. Яны хутчэй скажуць, што вы змагаліся ня супраць Мокрута, як чалавека, а супраць яго недахопаў, значыць, па сутнасьці, змагаліся за Мокрута. Ён чалавек яшчэ малады, жыцьцё, яго яшчэ наперадзе. Заўважылі, што ўжо нават сёньня ён ня вельмі лез на ражон? А старшынёй яго пакідаць нельга. Аб гэтым ведаюць усе дэпутаты, і ў раёне цяпер глядзяць на гэта іначай. Вунь Павал Паўлавіч, да чаго ўжо спакойны чалавек, і то ўзьняўся, нават мяне падганяе.

Так, гаворачы й зьлёгку спрачаючыся, яны й незаўважылі, як выйшлі на дабрасельскую дарогу й нават гоняў двое прайшлі па гэтай дарозе. Ільля Савіч прыпыніўся й працягнуў Дашы руку.

— Мне вельмі няёмка, — просячы прабачэньня, загаварыў ён, — што пакідаю вас адну, трэба было-б прайсьці з вамі й да самых Дабрасельцаў. Але я пастаю тут, пакуль вы хоць да млыноў дойдзеце, а там ужо недалёка.

Па голасу й па крыху разгубленых жэстах можна было заўважыць, што дырэктар запраўды перажываў.

— Я дабягу адна, — з усёй сваёй шчырасьцю запэўняла Даша. — Хіба гэта першы раз? І так вы ўжо далёка са мною прайшлі. Дзякую вам, шчыра дзякую. У вас і безь мяне многа ўсякіх спраў.

— Ды справы там не якія, — гаварыў далей Ільля Савіч, — але сёньня мне яшчэ абавязкава трэба напісаць аднаму свайму вучню пісьмо. Былому, праўда. Заўтра авіяпоштай пашлю.

Дырэктар глядзеў на Дашу з уцешнай усьмешкаю, а яна замаргала спачатку нездагадліва й разгублена, а потым, зразумеўшы, аб чым ідзе гаворка, заіскрыла радаснымі вачамі й ухапілася за дырэктараву руку.

— Як я вам удзячна, Ільля Савіч, каб вы толькі ведалі!

Ідучы далей адна, дзяўчына не магла сабрацца са сваімі думкамі, уражаньнямі. А іх было так многа, і такія яны былі ўсе важныя: і радасныя, і трывожныя. Хоць ногі міжвольна й зьбіваліся на бег, але ня было жаданьня хутчэй убачыць Дабрасельцы. Хоць трохі й страшнавата было адной, але думалася аб тым, каб дарога працягнулася як мага больш, каб даўжэй заставацца ў самаце. Вось чаму, калі Даша ўбачыла, што з-пад бяскрылых млыноў ёй напярэймы выходзіць нейкі чалавек, то перш, чым падумаць аб іншым, у яе мільганула шкадаваньне расстацца са сваімі марамі. Чалавек выйшаў на дарогу й стаў. Дзяўчына таксама прыпынілася, стараючыся разглядзець у цемры, што гэта за чалавек.

— Ня бойся, Даша, падыходзь, — пачула яна голас і пазнала Мокрута. — Я проста чакаў цябе тут, каб ісьці разам дадому.

У дзяўчыны трохі скаланулася сэрца, але яна не паказала спалоху, пайшла. Успомнілася, як паглядваў на яе Мокрут у час партыйнага сходу. Вочы былі мутныя нібы застыглыя, і цяжка было зразумець, што яны выяўлялі. Можна было падумаць, што гэты чалавек жадаў дзяўчыне самага горшага на сьвеце, нават сьмерці, і можна было падумаць, што нічога дрэннага не жадаў.

Падыйшоўшы, і цяпер Даша глянула Мокруту ў вочы, і спалох яе апаў. Ня так убачыла яна, як адчула, што ў вачах старшыні цяпер толькі сум, а ніякай злосьці няма. Сам ён быў ссутулены, уцягнуты ў каўнер кожанкі й рукі трымаў сьціснутымі адна пры аднэй у рукавах. Відна было, што апрача перажываньняў, магчыма нават некаторага раскаяньня, ён яшчэ й добра прамёрз, седзячы пад млынамі, бо са сходу ён пайшоў даўнавата.

Пайшлі далей, не сказаўшы адзін аднаму больш ні слова. Даша аднэй машыннай калеінай, а Мокрут другою. Ён толькі выняў рукі з рукавоў, памахаў імі трохі й апусьціў у глыбокія, але, відаць, прахалоджаныя кушэні.

— Замёрз ты? — праз некаторы час спытала Даша. Ёй ужо цяжка было не падаць ніякага голасу.

Мокрут павёў плячамі, крыху падвыпрастаўся, але не сказаў нічога, нібы спагада такая была не для яго.

— І трэба было табе сядзець пад гэтымі млынамі, — больш з дакорам чым з насымешкай сказала Даша. — Ішоў-бы дадому, у цяпло.

— Няма мне цяпер куды йсьці, — глыбока ўздыхнуўшы, нібы прамовіў, нібы прастагнаў Мокрут.

Крокі яго сталі няроўнымі й цядкімі, быццам падэшвы ботаў пачалі прыставаць да каляіны. Ён ішоў моўчкі яшчэ некалькі хвілін, а потым крыху адхіліў з Дашынага боку свой каўнер і загаварыў ужо ня так глуха й нявыразна, але суму ў голасе было яшчэ больш, думкі выходзілі няпоўнымі, нібы ўрэзанымі.

— Мая хата й раней ня была мне асабліва мілай, а цяпер дык... Каб не так холадна, то я начаваў-бы пад млынамі. Добра было некалі ў партызанах: залезеш у будан, укрыешся...

Даша маўчала, бо ні спрачацца з Мокрутам, ні спачуваць яму ў яе ня было асаблівага жаданьня. Яна толькі ўсё думала, чаму ён чакаў яе: намерваўся чалавек пагаварыць, выкласьці душу, а можа й якая лаянка ў яго ў галаве, магчыма, нават помста. Страху аднак ня было, нешта не зьяўлялася такая думка, што Лявон можа учыніць ёй што-небудзь дрэннае.

— Значыцца мы сёньня імяніньнікі, — зноў загаварыў Мокрук. — Цябе з кандыдатаў і мяне з кандыдатаў. Здорава! Толькі цябе ў сябры, а мяне... Колькі год мне давялося пахадзіць у кандыдатах! І вось... Ну й злавалася ты на мяне сёньня, праўда? Усе злаваліся, нібы я ўсім ворагам стаў. Асабліва дырэктару.

— Ніхто не злаваўся, — спакойна заўважыла Даша. — Гаварылі тое, што думалі.

— Усё прыпомнілі, — незласьліва сказаў Мокрут і зноў глыбока ўтуліўся ў каўнер, змоўк.

Дзяўчыне здалося, што ён пайшоў крыху жвавей, і яна адчула нейкую палёгку ад гэтага. Хутчэй-бы дайсьці, а там ён няхай, як хоча. Захоча выгаварыцца, дык знойдзе ахвотнікаў паслухаць, а пацягне яго на адзінокае маўчаньне, дык трапіцца й для гэтага. Глянула ў бок Дабрасельцаў і быццам-бы зарадавалася, што скрозь рэдкі не халодны туманчык убачыла сьвятло электрычнага ліхтара, які зноў гарэў каля вёскі. Значыцца, ужо недалёка асталося йсьці. Але выйшла так, што й Мокрут, бадай, у гэты-ж самы час глянуў на ліхтар й не прыбавіў яшчэ кроку, чаго якраз чакала Даша, а прыкметна збавіў. Яго, відаць, не цягнулі Дабрасельцы. Дзяўчына сама пайшла хутчэй, аднак старшыня ня рушыў за ёй, а, хрыпла кашлянуўшы, сказаў:

— Не сьпяшайся так, Даша. Яшчэ ня позна.

І параўняўшыся зь ёю, стаў прасіць, каб яна пагаварыла зь ім, забыўшыся аб усім, што адбылося й што выявілася за апошнія часы, пагаварыла так, як яны ўсё-ж такі не адзін раз гаварылі ў мінулыя гады.

(Далей будзе)

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

Сьв. Пам. Адварды Будзька

(Заканчэньне з 3-яй бачыны)

рышчаў сялянства, як кірмашы й фэсты, лучыліся сілы Гімназіі й пазашкольныя. Так было, напрыклад, на далёкаведамым будслаўскім фэсьце 3 ліпеня ў 1918 годзе. калі зьехалася да 10.000 людзей. Вучні прадавалі на рынку беларускія кніжкі. Пасьля ймшы дырэктар Гімназіі прачытаў для народу публічную лекцыю з археалёгіі. Надвечар Драматычны Гурток даў беларускую пастаноўку, а вечарам адбыўся канцэрт з удзелам струннага аркестру й хору, які закончыўся танцамі. Уражаньні з усяго бачанага й чутага на тадышнім будслаўскім фэсьце доўга камэнтаваліся па ўсім павеце й навет у такіх глухіх вёсках, дзе раней нічога ня было ведама пра беларускі рух.

Так будавалася й расла беларуская справа ў Будславе й ваколіцах. На працягу двух гадоў тут адбывалася цэлая рэвалюцыя, пачынальнікам і кіраўніком якой быў Адварды Будзька. Цешыліся будслаўцы з сваей працы, а разам зь імі цешыўся іх духовы правадыр, бачучы ўраджай з таго, што сеяў на працягу 20 год. Успамінаючы, што рабілася тады ў Будславе — мімавольна паўстае пытаньне: што сталася-б зь Беларусьсю, калі-б гэтую рэвалюцыю ня здушвалі акупанты з усходу й захаду, калі-б такія людзі, як Адварды Будзька маглі праводзіць свае сьмелыя пляны бязь ніякіх перашкодаў па ўсім беларускім абшары? Напэўна Беларусам ня трэба было-б тады вандраваць па нявольных і вольных краінах сьвету.

Дакладчык наўмысьля спыніўся над Будславам, каб шырэй прадставіць адзін з адрэзкаў дзейнасьці Адварда Будзькі — найбольш яму ведамы. Розных адрэзкаў дзейнасьці нашага вялікага дзеяча было нямала. І напэўна на эміграцыі ёсьць людзі, што былі ўдзельнікамі, або сьведкамі іх. Таму было-б вельмі пажадана, каб яны падзяліліся зь беларускім грамадзтвам тым, што ведаюць пра ягонае жыцьцё й дзейнасьць. Гэта-б ня толькі папоўніла вобраз гэтай дзейнасьці, але й было-б значным укладам у гісторыю беларускага руху. Маючы гэта на ўвеце, дакладчык толькі агульна гаварыў пра дзейнасьць Адварда Будзькі ў часе апошняй нямецкай акупацыі Беларусі й у часе прабываньня яго на эміграцыі, пакідаючы шырэйшае слова для тых, што былі сьведкамі гэтай апошняй дзейнасьці.

* * *

Адварды Будзька вызначаўся надзвычайнымі рысамі характару. Фізычна ён быў малога росту, сьціплым і надзвычай мала вымагаючы для сябе: ня гнаўся за раскошным жыцьцём, еў скромна — быў вэгэтарыянцам і абстынэнтам, ня курыў — ды навет унікаў гарбаты, піў ваду, або малако. Апранаўся чысьценька й акуратна, але ня любіў франтаства. Унікаў усяго, што было шкодным фізычна й духова ці то для яго самога, ці для іншых. Але якая веліч духу й сэрца была ў гэтага чалавека! Якая адзыўчывасьць на чужую бяду, на крыўду людзкую! Чужое няшчасьце ён перажываў як сваё. Яго жаданьнем было, каб кажнаму было добра, каб кажны быў шчасьлівы. Ён цешыўся чужым шчасьцем як сваім і ніхто хіба ў яго не заўважыў навет найменшай ноткі зайздрасьці, або помсты. Колькі людзей прыпомняць ягоную помач, ахвярнасьць, дабрадзейнасьць ды адзыўчывасьць на чужую бяду! І тыя, якіх ён, наражаючы сябе на небясьпеку, вызваліў з арыштаў у часе розных палітычных зьменаў, і тыя, што былі ў бядзе й дзякуючы яму атрымалі працу, і тыя, што дзякуючы яму дабіліся асьветы, і тыя, што зь яго парадай знайшлі жыцьцёвы шлях і яшчэ шмат якія, што бачылі ў яго асобе прыяцеля, павадыра, дарадніка й лекара на розныя беды. Зь ягонага жыцьця й дзейнасьці плыла глыбокая гуманнасьць, яна адбівалася ў яго шляхотных рысах твару. Ягоны патрыятызм, адданасьць беларускай справе базаваліся на гэтай глыбокай гуманнасьці, на адчуваньні тых бедаў і няшчасьцяў, якія абступілі беларускі народ, на адчуваньні крыўдаў і зьдзекаў, якімі кармілі Беларусаў чужыя ўлады. Згодна з сваёй добрай, гуманнай натурай ён хацеў, каб Беларусам было добра, каб яны былі шчасьлівымі. Дзеля гэтага трэба было беларускаму народу адраджацца ды здабываць сваю культуру й палітычную незалежнасьць.

У пары зь яго гуманнасьцяй йшла крышталь чэснасьць, праўдамоўнасьць, справядлівасьць і дабрата — найвялікшай чалавечай цноты. Нікому, хто знаў Адварда Будзьку, навет у галаву ня прыйшло, шло ён мог схлусіць, ці ашукаць каго. У вадносінах да людзей ён быў заўсёды ветлівым, вытрыманым, ляяльным і выразумелым, а ў вадносінах да спарвы — абавязкавым, акуратным, адказным, працавітым і безінтарэсоўным. Беларуская грамадзкая справа была ў яго на першым мейсцы. І ніхто хіба ня ўмеў так пагадзіць асабістае жацьцё з грамадзкай дзейнасьцю.

Гэта быў рэдкі чалавек. Цяжка знайсьці такога другога ня толькі сярод беларусаў, але й сярод іншых. Гэта быў чалавек малога цела, але вялікай душы й вялікага сэрца. Якое-ж няшчасьце, што яго нястала сярод нас! Ды яшчэ большае няшчасьце таму, што нястала яго ў гэтым часе маны, ашуканства ў цэлым сьвеце й цяжкога становішча беларускай справы.

Хай-жа будзе яму лёгкай амэрыканская зямля, а нам і нашым патомным хай прысьвячае сьветлая памяць аб ім у жыцьці й грамадзкай працы.

* * *

Даклад быў заснаваны выключна на асабістых успамінах дакладчыка.

Пасьля дакладу й вымены думак — на прапазыку а. Мацукевіча прысутныя выказалі пажаданьне, каб былі выданы ўспаміны Адварда Будзькі, калі ён іх пакінуў, а калі не — каб радня яго й бліжэйшыя сябры й знакомыя пастараліся апублікаваць матар'ялы аб ягоным жыцьці й грамадзкай дзейнасьці.

Прысутны

Аб „тэзісах...“

(Заканчэньне зь 1-ай бачыны)

партыю (бальшавікоў) Беларусі **як саставную й неад'ёмную частку РКП(б)** (падкрэсьленьня наша — М. К.).

Вось якімі шляхамі-дарогамі ходзіць бальшавіцкая лёгіка! Расейская камуністычная партыя стварыла БССР. У выніку гэтага беларускі народ, быццамбы набыў сваю нацыянальную незалежнасьць і дзяржаўнасьць» (да таго яшчэ «упяршыню за сваю шматвяковую гісторыю» (?!)...), а камуністычная партыя Беларусі, носьбіт і ўвасабленьне гэтай «нацыянальнай незалежнасьці й дзяржаўнасьці» БССР, застаецца «**складовай і неадлучнай» часткай расейскай камуністычнай партыі** (падкрэсьляньне наша — М. К.)

Што кампартыя Беларусі, ня гледзячы на некаторыя зьмены ў ейным нацыянальным складзе, зьяўляецца «складовай і неадлучнай» часткай расейскай камуністычнай партыі, у гэтым нельга не згадзіцца з Аддзелам прапаганды й агітацыі ЦК КПБ. Тую дэнацыяналізатарскую й русыфікацыйную палітыку, якую ёй на Беларусі вызначыла ейная маскоўская патронка, КПБ верна й пасьлядоўна праводзіць у жыцьцё. Тут усё згаджаецца. Аднак паўстае непаразуменьне, калі мы падыходзім да пытаньня «нацыянальнай незалежнасьці» і сувэрэннасьці» БССР. Гэтым разам мы пакідаем з боку ролю народу, бо савецкая «мадэрная дэмакрацыя» умее абыходзіцца безь яго... Але як КПБ ухітраецца «незалежна» і «сувэрэнна» гаспадарыць у БССР, будучы «складовай і неаддзельнай часткай Расейскай кампартыі? — гэты «сакрэт» цікава было-б даведацца... Тэзісы сарамліва перамоўчваюць усю тую зьнічкавую функцыю, неганаровую ролю часовага служкі, якую кампартыя Беларусі мусіць выконваць на загад сваёй «старэйшай сястры й маткі» — ВКП(б) на працягу наступных год. Тэзісы ні словам не ўспамінаюць, што на аснове «ўсемагутнага» распараджэньня з Масквы, сёлетнія «юбіляры» — БССР і КПБ — павінны былі канчаць самагубствам і зноў нараджацца адпаведна ў форме Літ-Белу й кампартыі Літвы й Беларусі, і гэтую далёка ад славы й гонару працэдуру нашыя «юбіляры» мусілі паўтарыць яшчэ раз. Да гэтага й звужаецца «слаўны» шлях кампартыі Беларусі. Будучы створанай толькі для выконваньня дырэктываў Крамля, яна ня толькі ніколі не ўзьняла й ня ўзьнімае голасу пратэсту, калі жывое цела Беларусі рэзалі й рэжуць на кускі, або калі масава расстрэльвалі ейных больш парадачных сяброў, але навет тады, калі ёй усёй загадвалі «паміраць» з усімі ейнымі дзяржаўнымі атрыбутамі й нараджацца нанова ў больш мізэрным, больш нядхалімным і больш подлым выглядзе.

Дарэмныя надзеі, таварышы з ЦК КПБ, што гадавіну стварэньня гэтай страшнай правакацыі, якую вы апраўдваеце й прадаўжаеце, беларускі народ будзе ўважаць сваім нацыянальным сьвятам!

Да «тэзісаў» пры нагодзе яшчэ вернемся.

М. Кручкоўскі

Зь беларускага жыцьця

ЗША

БЕЛАРУСКАЕ ЖАНОЧАЕ ЗГУРТАВАНЬНЕ Ў КЛІВЭЛЯНДЗЕ

У нядзелю 19 кастрычніка 1958 г. у сьвятліцы Беларускага Царкоўнага Дому ў Клівэляндзе была разыйграная лятарэя на беларускую народную вопратку, ладжаная Беларускім Жаночым Згуртаваньнем у Клівэляндзе.

Лёсы цягнула сямігадова Рагнеда Грышкевіч. Тым асобам, якія ня жывуць у Клівэляндзе, выйгрышы будуць перасланыя.

Беларускае Жаночае Згуртаваньне ў Клівэляндзе перапрашае за спозьнены розыйгрыш і адначасна складае шчырую падзяку ўсім тым, хто спрычыніўся да посьпеху лятарэі.

Б. Ж. З.
у Клівэляндзе

Канада

ТАРОНТА, АНТ. ПАКРОЎСКАЕ ЧАСТАВАНЬНЕ

У нядзелю на Пакровы парафіянкі прыходу БАП Царквы імя Кірылы Тураўскага зладзілі пачастунак, на які пасьля Багаслужбы сабралася шмат парафіянаў. З гэтае нагоды была вынесеная падзяка жанчынам за іхную грамадзка-сяброўскую руплівасьць, а таксама пажаданьне больш наладжваць падобныя сустрэчы.

НЕСПАДЗЕЎКІ СЯБРОЎСТВА

Калі стала агульнаведама пра шлюб сп. Я. Чорнага з сп-няй Н. Слаўко, сябры й сяброўкі апошніх вырашылі зрабіць неспадзеўку маладым. Закупіўшы падарункі, яны ў нядзелю 5 кастрычніка, за тыдзень перад шлюбам, завіталі да дому маладых — дзяўчаты да Н. Слаўко і хлопцы да Я. Чорнага. Вечарам гэтага самага дня абедзьве партыі спаткаліся пры вясёлай музыцы ў Беларускім Доме.

ЛІСТ АД ЛІДЭРА ЛІБЭРАЛЬНАЙ ПАРТЫІ КАНАДЫ МІСТЭРА ПІРСЭНА

Галоўная Ўправа З. Б. К. атрымала 3 лісты ад лідэра лібэральнай партыі Канады (ён-жа й лідар апазыцыі ў фэдэральным парляманьце Канады) містэра Пірсэна. У вадным зь іх мр. Пірсэн пераслаў шматлікія цытаты із сваіх прамоваў у Парляманьце пры абсуджэньні новых законаў што да іміграцыі й імігрантаў краіны. У другім лісьце паданы поўны зьмест ягонай прамовы ў тэлевізыі ў кастрычніку. Містэр Пірсэн выказаў надзею асабіста спаткацца з прадстаўнікамі Ўправы ў недалёкай будучыні.

ЛІСТ З КАРАЛЕЎСКАЙ БІБЛІЯТЭКІ

На імя старшыні Галоўнае Ўправы З. Б. К. быў перасланы ліст з Каралеўскай Бібліятэкі (ліст быў перасланы праз Гэнэрал-Губэрнатара Канады), у якім каралеўскі бібліятэкар з даручэньня Каралевы Элізабеты II дзякаваў за перасланую туды кніжку аб Беларусі на ангельскай мове, а таксама за надасланыя пажаданьні ад Беларусаў Канады.

НАРАДА СТАРШЫНЯЎ АДДЗЕЛАЎ КАНАДЫ

У нядзелю 12 кастрычніка ў Таронта адбылася першая нарада старшыняў аддзелаў З. Б. К. На нарадзе былі высьветленыя шматлікія арганізацыйныя пытаньні, ды зроблена цэлы шэраг прапановаў што да далейшай працы Галоўнае Ўправы, наладжаньня сьвяткаваньня 10-ці годзьдзя ЗБК ды правядзеньня 10-га Зьезду ЗБК.

ВОСЕНЬСКІ БАЛЬ

Мінула цёплая пара году, і таронтаўцы зноў распачалі свой сэзон забаваў, як заўсёды, гэтай восеньню. Голоўная Ўправа зарганізавала ў сыботу 4 кастрычніка першы восеньскі баль гэтага году, які прайшоў не з малым посьпехам, ня гледзячы на тое, што не ўдалося наняць прыгажэйшай залі. Настрой падняўся ў пазьнейшыя гадзіны, і толькі 12-ая змусіла ўсіх разыйсьціся па хатах. Чарговая забава адбудзецца 15 лістапада.

ДАКЛАД АБ АДВАРДЗЕ БУДЗЬКУ

У нядзелю 19 кастрычніка ў сьвятліцы Беларускага Дому Беларусы Таронта выслухалі цікавы даклад аб жыцьці й дзейнасьці сьв. памяці Адварда Будзькі.

Дакладчык др. Жук не пашкадаваў часу й дарогі, каб пазнаёміць прысутных аб слаўнай працы нябожчыка на карысьць беларускага народу.

Урачыстая перадача беларускіх кніжак Таронцкаму ўнівэрсытэту (25. 10. 58.) На здымку зьлева направа: сп. К. Акула, містэр Фолі, заступнік галоўнага бібліятэкара, і сп. А. Маркевіч.

БЕЛАРУСКІЯ КНІЖКІ ДЛЯ КАНАДЗКІХ БІБЛІЯТЭКАЎ

Галоўная Ўправа ЗБК ужо ад некалькіх месяцаў праводзіць зборку беларускіх кніжак, а таксама грошай на куплю кніжак сярод Беларусаў правінцыі Антарыё з мэтаю перадаць іх, як падарунак ад Беларусаў у Канадзе, канадзкім бібліятэкам. У выніку акцыі сабрана Садбурскім аддзелам ЗБК (зьбіральнік — К. Каранеўскі), 60 дал., Таронцкім аддзелам — 76 дал. (зьбіральнік А. Маркевіч), а таксама паступіла й некалькі кніжак. За гэтыя грошы былі закупленыя шматлікія кніжкі й перасланыя або перададзеныя ўрачыста канадзкім бібліятэкам. Зборка кніжак і грошай будзе працягвацца далей. Наступна былі перасланыя кніжкі для ўнівэрсытэтаў: Монтрэаль — 16 кніжак; Аттава — 39 кніжак; Вінніпэг — 24 кніжкі і Ванкувэр — 24 кніжкі. У таронцкую публічную бібліятэку ўрачыста пераданыя прадстаўнікамі Управы (сп. А. Макарэвіч і мгр. М. Арцюх) у сыботу 6 жнівеня першыя 34 кніжкі, пазьней, далейшыя 13. У сыботу 25 кастрычніка былі таксама ўрачыста пераданыя сп. сп. А. Маркевічам і К. Акулам 33 кніжкі для таронцкай унівэрсытэцкай бібліятэкі, за што заступнік галоўнага бібліятэкара містэр Фолі шчыра дзякаваў у сваіх славах.

Было-б вельмі пажаданым, каб усе Беларусы Канады прынялі ўдзел у зборцы, дапамагаючы гэтым самым зрабіць нацыянальную справу.

БАЛЬ КРЭДЫТОВАЙ КАСЫ

У сувязі з штогоднім адзначэньнем інтэрнацыянальнага дня крэдытовых юньяў, беларуская Крэдытовая каса ў Таронта зладзіла 1 лістапада свой традыцыйны баль, на які зыйшлося шмат моладзі з шматлікіх мясцовасьцяў правінцыі. Баль прайшоў надзвычай удала. Правялася таксама лятарэя, даход зь якой пайшоў на кніжкі.

ДАКЛАД НА ТЭМУ: «БЕЛАРУСКІ НАРОД І АРЫСТАКРАТЫЯ»

2 лістапада адбыўся даклад сп. К. Акулы на тэму «Беларускі Народ і арыстакратыя». Дакладчык вельмі трапна прааналізаваў прошлае беларускай нацыі, ейнае змаганьне, а таксама ролю беларускай арыстакратыі на працягу стагодзьдзяў. Пасьля дакладу завязалася жывая дыскусыя ў сувязі з тэмаю.

Пасьля дакладу слухачы мелі нагоду пазнаёміцца зь беларускаю радыяпраграмаю з 12 кастрычніка зь Нью Ёрку, запісаную на магнэтафонную йстужку.

ДЗЕСЯТЫ ЮБІЛЕЙНЫ ЗЬЕЗД ЗГУРТАВАНЬНЯ БЕЛАРУСАЎ У КАНАДЗЕ

Згодна пастановы апошняга паседжаньня Галоўнае Ўправы адбудзецца 24 і 25 студзеня наступнага году ў Таронта дзесяты юбілейны Зьезд Згуртаваньня Беларусаў у Канадзе. Пастаноўлена таксама ўрачыста адзначыць у першы дзень Зьезду 10-цігодзьдзе ЗБК, што прыпадае на 28. 11. 1958 г.

У САДБУРЫ, АНТАРЫЁ

Скарбнік аддзелу ў Садбуры, сп. К. Каранеўскі надзвычайна прыхільна аднёсься да справы зборкі грошай на беларускія кніжкі, сабраўшы сярод сваіх суродзічаў 60 дал. Сам асабіста ён ахвяраваў 45 дал., а такасама падараваў 18 кастрычніка собскіх 12 кніжак Садбурскай публічнай бібліятэцы, гэтым давёўшы агульны лік беларускіх кніжак у бібліятэцы да 20 паасобнікаў.

У Лёндане, Антарыё. 19 кастрычніка тут быў зладжаны разьвітальны вечар сябру аддзелу сп. Зайка. Сп. Зайка пераходзіць на пэнсію й пераяжджае на сталае жыхарства да свае дачкі ў Таронта. На вечары прысутнічалі таксама прадстаўнікі Таронцкага аддзелу.

Апошнімі тыднямі Ўправа Аддзелу наладзіла вялікую лятарэю зь вялікімі выйгрышамі. Лётарэйныя білеты будуць рассылацца па ўсіх беларускіх асяродзьдзях Паўночнае Амэрыкі. Час розыйгрышу будзе сваечасова паданы ў прэсе.

Супольнае адзначэньне 38-ых угодкаў Дня Герояў Беларусі ў Таронта. Упяршыню пасьля колькіх гадоў перарыву Беларусы Таронта дамовіліся, ня гледзячы на свае розныя ідэалягічныя напрамкі й разыходжаньні, адсьвяткаваць супольна ў нядзелю 30-га лістапада г. г. 38-ыя угодкі Слуцкага Паўстаньня.

А. —віч

ПОШУКІ

Пугачова К. І., 1915 году народжаньня, Гомельскай вобласьці, Буда-Кашалёўскага раёну, в. Губічы (Дубянёк), шукае сястра Н. Пугачова.

Весткі слаць на адрыс:
Mrs. N. Gellesch
1735 Sterling Pl.
Brooklyn 33, N. Y. U. S. A.

ПРЭМІІ ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ Й ІМЯ ЯКУБА КОЛАСА

5-га лістапада гэтага году савецкія беларускія газэты апублікавалі наступнае паведамленьне:

«Урад Беларускай ССР устанавіў штогоднія літаратурныя прэміі — адну імя Янкі Купалы й адну імя Якуба Коласа.

Прэміі будуць прысуджацца штогод к 1 студзеня — дню ўтварэньня Беларускай ССР.

Палажэньне аб літаратурных прэміях імя Янкі Купалы й імя Якуба Коласа» будзе надрукаваны ў газэце «Літаратура і Мастацтва».

Да ведама нашых чытачоў.

Наступны нумар газэты «Б-на» выйдзе падвойным і будзе прысьвечаны 38-ай гадавіне Слуцкага Паўстаньня.

Рэдакцыя

„Прышчэпаўшчына“

(Заканчэньне зь 1-ай бачыны)

паў і ягоныя найбліжэйшыя супрацоўнікі. Росквіт сельскай гаспадаркі быў прыпынены накінутай Масквою калектывізацыяй, якая спрычыніла нашаму народу да гэтага часу незагоеныя раны.

Дзейнасьць Прышчэпава была абясслаўленая камуністычнай прапагандай. Ён быў арыштаваны й афіцыйна абвінавачаны, як праваднік кулацка- сталыпінскай зямельнай палітыкі. Яго бліжэйшыя аднадумцы й супрацоўнікі былі абвінавачаныя ў беларускім нацыяналдэмакратызьме, у кантакце із «шкодніцкімі» арганізацыямі Украіны, і зь сялянскай партыяй, на чале якое быў Кандрацьеў.

Рэктар Беларускай Сельска-гаспадарчай Акадэміі на нарадзе ў Маскве марксыстых-аграрнікаў абвінаваціў акадэміка Г. Гарэцкага, што ён «ужо ў 1922 годзе, будучы студэнтам былой Пятроўскай сельскагаспадарчай акадэміі, зарганізаваў контррэвалюцыйную арганізацыю — «Беларускую Ассацыяцыю», якая сярод сваіх «будзіць надзею і ўпэўненасьць у магчымасьць ператварэньня **беднай балоціста-сумнай Беларусі ў новую Данію».**

Прышчэпаў, Гарэцкі, Смоліч, Некрашэвіч і шмат іншых былі арыштаваныя. Лёс іх невядомы. Відаць, загінулі ў савецкіх канцэнтрацыйных лягерох. Аднак памяць аб наркомземе Прышчэпае й да гэтага часу ня выкараненая ў сялянстве. Таму зусім не выпадкова ў тэзісах ЦК КП Беларусі «Саракагодзьдзе ўтварэньня Камуністычнай Партыі Беларусі» Прышчэпаў надалей абясслаўліваецца, як правы апартуніст, «які выступаў супраць курсу партыі за калектывізацыю сельскай гаспадаркі». Відаць слава «прышчэпаўшчыны» і да гэтага часу ня зьмеркла сярод працоўнага сялянства Беларусі.

В. Б.

БАЦЬКАЎШЧЫНА

Беларускі тыднёвік палітыкі, культуры й грамадзкага жыцьця.

Выдавец: Уладзімер Бортнік

РЭДАГУЕ КАЛЕГІЯ

Артыкулы, падпісаныя прозьвішчам або ініцыяламі аўтара, не заўсёды выражаюць пагляды Рэдакцыі.

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011